■ Край, дзе я жыву

ПАЧАТАК — З ВЫТОКАЎ

Праводзячы краязнаўчую работу на месцах, перш за ўсё трэба зафіксаваць тое, што знаходзіцца на мяжы знікнення, — носьбітаў традыцыйнай культуры і элементы гэтай самай культуры ў яе рэгіянальных праяўленнях

Падчас «круглага стала», прысвечанага практычнаму краязнаўству і яго ролі ў гісторыі і выхаванні, яго ўдзельнікі нямала гаварылі аб тым, наколькі важна сабраць і захаваць сёння як мага больш падрабязныя звесткі пра кожны населены пункт нашай краіны, пачынаючы ад дакладных геаграфічных каардынат і версій паходжання назвы і заканчваючы наяўнасцю прадпрыемстваў. Поле для даследавання — найшырэйшае, і можа паўстаць пытанне, з чаго пачынаць, на што асабліва звяртаць увагу. Меркаванні на гэты конт самыя розныя. Напрыклад, даследчык традыцыйнай беларускай культуры, кандыдат філалагічных навук, галоўны рэдактар выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» Янка КРУК лічыць, што да маштабнай краязнаўчай работы павінна далучыцца не толькі грамадства і адукацыйная сістэма, але і сфера культуры, а пачынаць трэба з нематэрыяльнай спадчыны — традыцый, абрадаў, шанавання сакральных месцаў у той ці іншай мясцовасці.

— Прадпрыемства, звесткі пра якое будуць занатаваны ў працэсе краязнаўчай работы, заўтра можа быць рэарганізавана, закрыта. Але застануцца шматлікія сведчанні аб яго існаванні і дзейнасці — дакументы, архівы, людзі, якія на ім працавалі, — абгрунтоўвае сваю пазіцыю Іван Іванавіч. — Сабраць, звесткі пра гэта прадпрыемства, безумоўна, таксама трэба. Але перш за ўсё трэба зафіксаваць тое, што знаходзіцца на мяжы знікнення, — носьбітаў традыцыйнай культуры і элементы гэтай самай культуры. Таму што зніклае назад не вернеш. І на першае месца ў краязнаўчай рабоце я б паставіў клопат аб франтальнай фіксацыі каштоўнасцяў рэгіянальнай і лакальнай традыцыйнай культуры і яе старажытных абрадавых практык.

— Традыцыйная культура станавілася прадметам вывучэння этнографаў і фалькларыстаў на працягу дзесяцігоддзяў. Захаваліся шматлікія апісанні абрадаў, прывезеныя з экспедыцый, былі напісаны кнігі, абаронены многія дысертацыі... Што ж тады ў гэтым плане засталося мясцовым краязнаўцам, калі пра ўсё ўжо вядома?

— Наш замах на тое, што мы ўсё ў гэтым плане ведаем, нічога не варты. Бо сапраўды мы ўсё ведаць будзем толькі тады, калі прыедзем у кожную вёску і пагаворым з кожнай бабуляй. А гэтага не здолеў яшчэ зрабіць ніхто.

Свежы прыклад. Здавалася, што за доўгія гады працы, вывучэння, экспедыцый ведаем ужо пра ўсе абрады ў розных рэгіёнах. Раптам званок з Магілёўскага абласнога цэнтра народнай творчасці: «Прыязджайце, паглядзіце на нашу «Свячу». Нас запрасілі ў вёску Басценавічы Мсціслаўскага раёна, дзе давялося пабачыць абрад «Варвараўская Свяча». Мы назіралі за ім, ашаломленыя, бо такога дагэтуль не бачылі нідзе. Калі ў «Звяздзе» мы надрукавалі артыкул аб гэтым абрадзе з фотаздымкамі Анатоля Клешчука, пайшлі званкі, і аказалася, што на Магілёўшчыне амаль у кожным раёне ёсць свая «Свяча» — у в. Чарапы Шклоўскага раёна — Мікольская, у в. Наркі Чэрыкаўскага раёна — Петрапаўлаўская, у в. Баркалабава Быхаўскага раёна — Грамнічная... На сёння мы запісалі дзясятак такіх «Свечак». І ўсё дзякуючы мясцовым рупліўцам. А колькі яшчэ такога нязведанага, вядомага толькі ў адной вёсцы, «хаваецца» па ўсёй Беларусі!..

— Ёсць меркаванне, што традыцыйная культура ў кожнага рэгіёна свая, асабліва: абрады Палесся кардынальна адрозніваюцца ад абрадаў Паазер'я, а на Падняпроўі робяць усё зусім інакш, чым на Панямонні. Яно сапраўды так? Ці ёсць усё ж ва ўсёй нашай традыцыйнай культуры нейкая «агульнабеларуская» ідэя?

— Безумоўна, рэгіянальныя асаблівасці вызначаюць характар рытуальных практык. Так як не падобны адно на аднаго людзі, так між сабой адрозніваюцца і лакальныя традыцыі. Але ў аснове кожнага абрадавага дзеяння, ці то на Палессі, ці на Панямонні, ляжаць узаемадапамога, узаемападтрымка, узаемаслучанасць, шанаванне жывых і памерлых, каму ты абавязаны жыццём. Гэтая ідэя не столькі агульнабеларуская, колькі агульнацывілізацыйная: дыялог з Небам, самазахаванне і клопат пра тое, каб у сям'і быў дабрабыт. Родны дом — храм — могілкі — вось на чым замыкаецца ў рэшце рэшт жыццёвая сцежка кожнага з нас. Безумоўна, яна разгортваецца ў прасторы і ў часе, але аснова будзе адна і тая ж.

— Вывучаючы традыцыйную культуру, вы, без перабольшвання, аб'ехалі ўсю Беларусь. Што было для вас самым вялікім адкрыццём?

— Калі казаць з пункту гледжання эмацыянальнага, — гэта ўсё-такі «Ваджэнне і пахаванне стралы» ў Барталамееўцы Веткаўскага раёна, абрад, які ўпершыню пашчасціла назіраць гадоў трыццаць таму. Жанчыны ішлі на ўсю шырыню вуліцы, паклаўшы рукі адна адной на плечы — «вялі стралу» за вёску, каб маланка ўлетку абмінула пабудовы. І гэта было так уражліва, так незвычайна!

А яшчэ нярэдка здзіўляюць людзі, дакладней, сінтэз чалавека і абраду. Назіраючы за той жа «Варвараўскай Свячой», я сядзеў, адкрыўшы рот, гледзячы менавіта на ўдзельнікаў абраду — столькі зладжанасці і засяроджанасці было ў іх рухах, калі яны рабілі свячу. А псіхалогія абраду! Цікавая ўжо не столькі фантастыка самога дзеяння, колькі псіхалагічны аспект, уключанасць чалавека ў яго. Жанчына, з хаты якой свячу забралі ў суседнюю (кожны год свяча мяняе гаспадароў), сядзела за сталом, апусціўшы рукі. «Бы мужа з хаты вынеслі», — патлумачыла яна свой стан... Здзіўляе чалавек у кантэксце гэтай практыкі, яго паводзіны, яго жаданне дзяліцца або не дзяліцца сакральнымі ведамі.

Здзіўляешся падарункам лёсу. У Дубровенскім раёне пачулі выпадкова ад жанчын, што тут хадзілі «памінаць скідышаў». Зачапіліся за словы, сталі распытваць... Аказалася, тут на працягу дзесяцігоддзяў існаваў найцікавейшы абрад. Скідышы — гэта па-сучаснаму выкідышы — мёртванароджаныя неданошаныя дзеці. Жанчына, у якой здарылася такая бяда, у адзін з дзён пасля Тройцы ішла па вёсцы і гукала — збірала сяброўак па няшчасці. Яны ішлі на ўскраіну вёскі ў жыта, браліся па парах, гаварылі ці то замову, ці то малітву і пачыналі па жыце качацца. Рытуал зразумелы: жыта — сімвал жыцця; яны гэта рабілі, каб адрадзіць патэнцыю жыцця і здолець нарадзіць жывое дзіця... Але ж цікава! І, магчыма, толькі ў гэтай адной вёсцы рабілі менавіта так...

У многіх вёсках і сёння разам з традыцыйнымі Тройцай і Купаллем, Масленкай і Радаўніцай засталіся лакальныя рэчы, якія не перастаюць здзіўляць. Але яны цяпер існуюць на мяжы выжывання, не толькі з-за іншага грамадства, якое верыць больш у тэхнічны прагрэс, але яшчэ і таму, што паміраюць носьбіты гэтых абрадаў, так і не перадаўшы нікому сакральныя веды.

У вёсцы Стаі Лепельскага раёна, напрыклад, да нядаўняга часу насілі ад хаты да хаты штогод вялікі сасновы кол з «галавой» наверсе. Цікавы абрад, але ўжо, на жаль, ніхто не мог патлумачыць, чаму і навошта. Мы можам толькі меркаваць, што гэта быў знак Перуна, які насілі, ратуючы вёску ад маланкі.

— З тых шматлікіх сакральных месцаў, якія ёсць на нашай зямлі, куды вас самога цягне, калі здараюцца праблемы?

— Я не адкажу адназначна. На нашай зямлі кожная мясцінка своеасаблівая. Напрыклад, святыя крыніцы. Спытайце ў любога хіміка, і ён вам раскажа, што беларускія гаючыя крыніцы — гэта сапраўдная скарбонка мікраэлементаў і мінералаў. Прычым у кожнай свой састаў, значыць, кожная дае лячэнне ад нейкай пэўнай немачы. І калі на карце Беларусі пазначыць усе крыніцы з іх хімічным саставам, стане зразумела, што, праехаўшы па пэўным маршруце і набраўшы там вады, можна атрымаць палёгку ад амаль усіх хвароб. Проста трэба ведаць, якой вадой прамыць хворыя вочы, якой напіцца, каб не балела сэрца, у якую акунуцца, каб знайсці суцяшэнне... Таму, адказваючы на ваша пытанне, скажу толькі, што я пайду ў цяжкую хвіліну на нейкае месца ў залежнасці ад таго, што прывяло мяне да такога стану: смутак, хвароба ўнутраная ці проста душэўны неспакой... А наогул у мяне ў вёсцы каля бацькоўскай хаты ляжыць вялізны камень, які лечыць хваробы вачэй. Я, калі прыязджаю туды, заўсёды з ім размаўляю і прашу падзяліцца са мной сілай...

— Такая тонкая матэрыя як традыцыйная культура, на мой погляд, у наш час сутыкаецца з яшчэ адной пагрозай — ператварэннем яе ў культуру масавую. Паглядзець на той ці іншы абрад, як толькі аб ім становіцца вядома шырокай публіцы, прыязджаюць натоўпы людзей. Гэтыя самыя натоўпы ідуць да шануемых спрадвеку мясцін — крыніц, камянёў, векавых дрэў. Так, абрады і традыцыі дзякуючы такой увазе не знікаюць, але страчваецца іх сакральнасць, магія, аўтэнтычнасць... І невядома, што горш... Ці можна тут, на ваш погляд, знайсці «залатую сярэдзіну»?

— Аптымальным варыянтам было б, каб адраджэннем і захаваннем лакальных абрадаў займаліся на прафесійнай аснове (спецыялісты, якія скончылі, напрыклад, Універсітэт культуры і мастацтваў) ураджэнцы менавіта той мясцовасці, якія валодаюць лакальнай мелодыкай мовы, у якіх лакальная культура закладзена на генетычным узроўні. Але сёння ажыццявіць гэтую ідэю фактычна немагчыма. Застаецца спадзявацца, што выкладчыкі-прафесіяналы данясуць да сваіх студэнтаў, якія праз колькі гадоў паедуць працаваць на месцах, неабходнасць асцярожна і далікатна ставіцца да мясцовай традыцыйнай культуры, уважліва вывучаць яе ва ўсіх дэталях.

Што датычыцца «масавага паломніцтва» да сакральных мясцін... Даведаўшыся і даследаваўшы ўнікальны абрад «перапранання» каменнай «дзевачкі» ў Лельчыцкім раёне (в. Данілевічы), мы доўга спрачаліся, ці трэба паведамляць пра яго шырокай аўдыторыі. З аднаго боку, баяліся, што, калі пра абрад, накіраваны на дапамогу жанчынам, якія не могуць нарадзіць, даведаецца вялікая колькасць людзей, да «дзевачкі» пачнецца сапраўднае паломніцтва і сакральнасць, магія, таямнічасць дзеяння назаўсёды будзе страчана... А з другога боку — ці маем мы маральнае права ўтойваць гэтую інфармацыю, забіраць апошнюю надзею ў жанчын, якія мараць стаць маці? (Бо ёсць сведчанні, што «дзевачка» сапраўды дапамагае). Але няхай сюды прыйдзе ў велікодную ноч той, каму гэта вельмі трэба, а не проста цікаўны скептык...

Зрэшты, любы чалавек мае права прыехаць з сям'ёй і пастаяць каля гэтага дзівоснага каменя. І тут ужо размова будзе ісці аб культуры гэтай сям'і. Бо, на жаль, ні ў інтэрнэце, ні ў СМІ побач з апісаннем таго ці іншага шануемага месца мы не знойдзем такога простага і такога неабходнага напаміну: прыехаў у сакральнае месца — паводзь сябе належным чынам. І апісанне не пашкодзіла б — як менавіта паводзіць. Давайце выкладваць гэтую інфармацыю, звяртацца да моладзі — у нас адэкватная, кемлівая, цікаўная моладзь, ёй проста не хапае культурнай кампаненты, адпаведнай адукацыйна-выхаваўчай інфармаванасці. Як і старэйшым, і з-за гэтага сакральнае, спрадвечнае развальваецца: пахаванне ператварылі ў п'янку, вяселле — у ток-шоу або спектакль. Трэба стукацца ў душы нашых людзей, асабліва падрастаючага пакалення, тады і стаўленне будзе іншым. Знойдуцца, вядома, тыя, хто, валодаючы любой інфармацыяй, усё адно адкалупне ад сакральнага каменя кавалачак — на памяць. Але супраць яго — я перакананы — знойдзецца сотня тых, хто проста паважліва падыдзе, ціха пастаіць і папросіць дапамогі...

Гутарыла Алена ЛЯЎКОВІЧ

Фота БЕЛТА.

У апошні дзень Русальнага тыдня (наступны тыдзень пасля Тройцы) у вёсцы Камуна Любанскага раёна «гуляюць Русалінку» — паляць кастры, куды кідаюць галінкі клёна і бярозы, якімі аздаблялі падворкі на Тройцу. На заканчэнне ўдзельнікі Русалля гатуюць на кастры яечню і ладзяць застолле.

ЧЫРВОНЫ ЧЭРВЕНЬ-ЧАРАЎНІК



Склаў Лявон ЦЕЛЕШ., г. Дзяржынск.

Па гарызанталі: **1.** Раніцай ... пахне мацней, чым звычайна — да дажджу (прыкм.). **6.** «Ідуць касцы, ідуць, як ...\\ льецца смех іх разудалы». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля». **8.** «На лугах шырока\\Размахнуўся ...». З верша А. Вялюгіна «Летнік». **9.** Жыццёвая сіла, сокі (разм.). **10.** Сценка кузава грузавога аўтамабіля. **12.** Тое, што і пылінка. **15.** Прысвятак беларускага народнага календара, які прыпадае на дзень летняга сонцастаяння, 21 чэрвеня. Раса на ... — да ўраджаю льну і канопляў» (прыкм.). **16.** У старажытнагрэчаскай міфалогіі — легендарны спявак і музыкант. **17.** У чэрвені моцныя ... — да ўраджлівасці, а частыя туманы абяцаюць ураджай грыбоў (прыкм.). **18.** «Быў чэрвень. \\Эшалоны ...\\На фронт спяшаліся, ішлі». З верша М. Танка «Мы зноў на месцы тым...». **21.** «Перайшла ўжо ў лета вясна,\\.. хлеб залаты выспляе». З верша А. Астрэйкі «Я на ўзлессі стаю веснавым». **22.** Назва мужнага, прыгожага юнака, мужчыны (перан.). **27.** Назва свята, якое адзначалі 20 чэрвеня. **29.** «Свішчуць ... ў траве, проста дзіва, гульба». З верша Я. Купалы «Касьба». **30.** «Змарыўся несці ношку ...\\Чырвоны чэрвень-чараўнік». З верша А. Мінкіна «Чэрвень». **31.** У канцы чэрвеня ... лета глядзіць праз прасла (прык.). **32.** ...-льняніца. Дзень ільну, які адзначалі 3 чэрвеня. Калі на ... непагадзь, то і восень будзе дажджлівай (прыкм.). **33.** Пылок на злакавых раслінах.

Па вертыкалі: **1.** Спецыяліст па таксацыі. **2.** Прыйшоў Амос (28 чэрвеня) — цягне ўгору ... (прык.). **3.** Верхні слой скуркі пладоў цытрусавых. **4.** ... палявы. Шматгадовая расліна з галінастымі сцёбламі і лускаватым лісцем; пустазелле. **5.** Старажытнарымская багіня, жонка Юпітэра. **7.** ... ды лебяда — для палетку бяда (прык.). **11.** ..., або Сёмуха. Свята, якое сёлета адзначалася 8 чэрвеня. **13.** Прыгожы белы матылёк, вусень якога есць капусту. **14.** Травяное покрыва сенакосу, лугоў. **19.** Жаночы орган клеткі, з якога ўтвараецца плод пасля апладнення пылком. **20.** Прысвятак, які адзначалі 12 чэрвеня; у гэты дзень абліваліся, каб пайшоў дождж. **23.** Перад дажджом бабры працуюць усю ноч, а жабы выпаўзаюць на ... (прыкм.). **24.** У беларускай міфалогіі лясны дух. **25.** ... кумцы па сакрэту, а ... — усяму свету (прык.). **26.** Тонкія асцюкі на каласах жыта, ячменю, пшаніцы. **28.** Які чэрвень — такое і ... (прык.).

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:

Па гарызанталі: 1. Таварэ. 6. Жмарыі. 8. Чэрвень. 9. Кнёх. 10. Борт. 12. Пацуцьлінка. 15. Тодар. 16. Арфей. 17. Росы. 18. Рана. 21. Сонца. 22. Сокал. 27. Дзевятуха. 29. Косы. 30. Лета. 31. Макушка. 32. Аўёна. 33. Красса.

Па вертыкалі: 1. Таксатар. 2. Аёс. 3. Цярпа. 4. Хвошч. 5. Ноная. 7. Аст. 11. Тройца. 13. Канучніца. 14. Траваціён. 19. Лесцік. 20. Абліваха. 23. Бевар. 24. Лясун. 25. Кумка. 26. Асцё. 28. Сена.

Даты Падзеі Людзі

1884 год — нарадзілася Аляксандра Львоўна Талстая, руская пісьменніца, мемуарыстка. Па завяшчанні бацькі Л.М. Талстога атрымала аўтарскія правы на яго літаратурную спадчыну. У 1914 годзе, скончыўшы курсы сясцёр міласэрнасці ў Маскве, пайшла на фронт. Узнагароджана трыма Георгіеўскімі медалямі. Пасля вайны вярнулася ў Ясную Паляну і ўсё сваё жыццё прысвяціла ўвекавечанню памяці Л.Н. Талстога. Працавала захавальніцай музея-сядзібы «Ясная паляна», затым — дырэктарам Дзяржаўнага музея Л.М. Талстога ў Маскве. Памерла ў 1979 годзе.

1909 год — у Мінску адкрылася трэцяе жаночае гарадское чатырохкласнае вучылішча з жаночым прафесійным аддзяленнем. На працягу 3 гадоў там вывучаліся кравецкае і белашвейнае рамёствы, рукадзелле, чарчэнне, маляванне. Гадавая плата складала 15 рублёў. У 1914 годзе пры вучылішчы працавала жаночая нядзельная школа мінскага аддзялення Расійскага таварыства абароны жанчын.

1939 год — нарадзіўся Алег Рыгоравіч Янчанка, беларускі і расійскі арганіст, кампазітар, педагог, народны артыст Расіі (1997). У 1964 годзе скончыў Маскоўскую кансерваторыю. У 1963-1971 гг. саліст Беларускай філармоніі, выкладчык Беларускай кансерваторыі. Арганізатар і першы мастацкі кіраўнік Мінскага камернага аркестра (цяпер Дзяржаўны камерны аркестр Рэспублікі Беларусь). З 1971 г. саліст Маскоўскай філармоніі. Аўтар опер «Мыйдадзір», «Балаганчык», балета «Кастусь Каліноўскі», 4 сімфоній, канцэртаў для розных інструментаў з аркестрам, для аргана, музыкі да драматычных спектакляў, кінафільмаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1984). Дыпламант Міжнароднага конкурсу арганістаў ім. І. Баха (Лейпцыг, 1964). Памёр у 2002 годзе.

Было сказана

Алесь РАЗАНАЎ, паэт і перакладчык:

«Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор — мова».

НАРОДЖАНЫЯ 18 чэрвеня

Гэта, як правіла, людзі закрытыя. Яны валодаюць вельмі моцнай энергетыкай, таму здольныя ўздзейнічаць на сваіх блізкіх нават на адлегласці. Па гэтай прычыне з імі лепш не сварыцца і не варагаваць. Яны ўмеюць распараджацца грашыма, асабліва жанчыны. Хваляванні і перажыванні блізкіх людзей разумеюць, як ніхто іншы. З іх атрымліваюцца цудоўныя дарадцы і кансультанты. Валодаюць арганізатарскім талентам, бываюць прыстойнымі адміністратарамі. Любяць знаходзіцца на вяршыні славы, патрабуюць пастаяннага ўхвалення як ад сваёй сям'і, так і ад усіх астатніх. Цудоўныя бацькі, якія надаюць увагу перш за ўсё фарміраванню характару дзіцяці. Звычайна народжаныя ў гэты дзень вельмі верныя і адданыя сваім сябрам, партнёрам, сям'і.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.37	21.45	17.08
Віцебск	4.18	21.43	17.25
Магілёў	4.27	21.35	17.08
Гомель	4.33	21.22	16.49
Гродна	4.54	21.58	17.04
Брэст	5.04	21.49	16.45

Месяц

Апошняя квадра 19 чэрвеня. Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Дарафея, Ігара, Канстанціна, Леаніда, Фёдара.*
К. *Альжбеты, Аманды, Паўлы, Марка, Марцэля.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Геамагнітныя ўзрушэнні

Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура

...у суседзяў

ВАРШАВА +20..+22°С	КІЕЎ +19..+21°С	РЫГА +20..+22°С
ВІЛЬНЮС +19..+21°С	МАСКВА +13..+15°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +14..+16°С

УСМІХНЕМСЯ

Логіка мужчын: навошта мыць кружку, з якой ты піў чай, калі зноў будзеш піць з яе чай?

Па выніках наведвання сайта расійскага Міністэрства аховы здароўя:

Соль — яд.

Цукар — яд.

Мяса — пякельны яд з джунгляў Амазонкі.

Цыгарэта — канец усяго жыцця на Зямлі.

Бутэлька піва ў пятніцу ўвечары — Сонца ператвараецца ў чорную дзірку.

Дыгідрагексаген зброевага плутонію — дазволеная харчовая дабаўка.

Усё! Трэба худзець! Іду-такі з працы, краем вока бачу: хтосьці побач...
А, не! Гэта мае шчокі...

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.

Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.611. Індэкс 63850. Зак. № 2480.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 17 чэрвеня 2014 года.